# ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

## ГІСТОРЫЯ БАЁЎ У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ЛЕТАМ 1941 г. У СУЧАСНЫМ НЯМЕЦКІМ НАВУКОВЫМ НАРАТЫВЕ

Ganzer, Ch. Kampf um die Brester Festung 1941. Ereignis – Narrativ – Erinnerungsort / Ch. Ganzer. – Paderborn : Verlag Ferdinand Schöningh, 2021. – 490 S.

Манаграфія Крысціяна Ганцара падрыхтавана да друку на аснове доктарскай дысертацыі, паспяхова абароненай амаль двума гадамі раней у Лейпцыгскім універсітэце.

Даследаванне прысвечанае малавядомым аспектам гісторыі нямецкага штурму і савецкай абароны крэпасці ў Брэсце летам 1941 г. Скрупулёзны аналіз гістарычных падзей на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці ўпершыню трапляе ў фокус спецыяльнай замежнай навуковай працы і амаль праз 80 гадоў пасля іх становіцца прыкметным гістарычным фактам у сучаснай германскай гістарыяграфіі дзякуючы шматгадовым пошукам гісторыка, добра вядомага беларускаму чытачу[1]. Замежны даследчык на старонках новай

[1] *Ганцар, К.* [Рэцэнзія] Штурм Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 36–37. – Рэц. на кнігу : Алиев, Р. В. Штурм Брестской крепости / Р. В. Алиев. – М. : Яуза ; Эксмо, 2008. – 800 с.; *Ганцар, К.* Памяць і забыццё : ушанаванне герояў Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар // Вяртанне ў Еўропу : Мінулае і будучыня Беларусі / пад рэд. А. І. Пашковіч. – Варшава : Лазарскі, 2011. – С. 140–147; *Ганцар, К.* «Гераізм, трагізм, мужнасць». Музей абароны Берасцейскай крэпасці / К. Ганцар, А. І. Пашковіч // ARCHE. – 2013. – № 2. – С. 43–59; *Ганцар, К.* Немецкие и советские потери как показатель продолжительности и интенсивности боев за Брестскую крепость / К. Ганцар // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2013 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2014. – Вып. 12. – С. 44–52; *Ганцар, К.* Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць / К. Ганцар // ARCHE. – 2014. – № 5. – С. 135–153; *Ганцер, К.* Воспоминания защитников Брестской крепости как исторические источники. Проблемы и шансы / К. Ганцер // Личность в истории. Героическое и трагическое : сб. материалов VI междунар. конф., Брест, 22–23 нояб. 2013 г. : в 2 ч. / под. ред. Е. И. Пашкович. – Брест : БрГУ им. А. С. Пушкина, 2015. – Ч. 2. – С. 32–42; *Ганцар, К.* Памяць пра вайну і акупацыю ў Беларусі на прыкладзе мемарыялаў «Брэсцкая крэпасць-герой» і «Хатынь» / К. Ганцар // ARCHE. – 2015. – № 9. – С. 284–304; *Ганцер, К.* Переводчик виноват. Влияние перевода на восприятие исторических событий (на примере отчета о боевых действиях по захвату Брест-Литовска генерал-майора Шлипера) / К. Ганцер // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 11 крас. 2014 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2015 г. – Вып. 13 : у 2 т. – Т. 1. – С. 39–45; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – 723 с.; *Ганцер, К.* Сталина длинная тень. Плен как ключевая проблема историографии обороны Брестской крепости / К. Ганцер // Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – С. 22–41; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.; *Ганцер, К.* Развитие нарратива о «героической обороне»

грунтоўнай навуковай працы[1] знаёміць нямецкага чытача з аўтарскім падыходам да крытычнага вывучэння двухбаковых падзей на тэрыторыі крэпасці летам 1941 г. У выніку яму ўдалося стварыць фундаментальную працу, праз якую ён спрабуе ўзняць навуковае асэнсаванне тэмы на якасна новы ўзровень і тым самым упісаць падзеі мінулага ў іх рэальны гістарычны кантэкст. У сваю чаргу аўтару гэтых радкоў хацелася б звярнуць увагу на тое, чым гэта кніга, арыентаваная пакуль што на намецкамоўную чытацкую аўдыторыю, можа быць надзвычай карыснай для беларускіх музейных работнікаў, студэнтаў і школьнікаў, асабліва спецыялістаў у сферы ваеннай гісторыі Беларусі.

Рэцэнзуемая кніга прысвечана надзвычай актуальнай па цяперашні дзень праблематыцы – гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Між тым, як правільна заўважае К. Ганцар, у беларускай гістарыяграфіі яна застаецца практычна недаследаванай, нягледзячы на вялікае багацце літаратуры па дадзенай тэме. Імпаніруе навуковая пазіцыя нямецкага даследчыка, які на старонках працы імкнецца не апраўдаць і не асудзіць дзеянні ці ўчынкі, а зразумець той час і тых людзей, якія апынуліся ў крэпасці і дзейнічалі з двух бакоў у баявых абставінах, а таксама прааналізаваць, інтэрпрэтаваць і вытлумачыць гістарычныя падзеі мовай выключана дакументальных фактаў. У такіх умовах перад нямецкім даследчыкам паўстае няпростая і даволі адказная задача – максімальна карэктна рэканструяваць складаны і, як высвятляецца, супярэчлівы ход падзей, раскрыць выключна двухбаковы характар баявых дзеянняў за крэпасць з апорай на новую базу крыніц, паказаць прынцыповыя разыходжанні пануючага музейнага наратыву і навуковага даследавання на аснове верыфікаваных ведаў. Адзначым пры гэтым, што К. Ганцар праводзіць вывучэнне гэтай тэматыкі на аснове метаду кампаратыўнага аналізу розных крыніц[2]. Ужо па гэтай прычыне новае

---

Брестской крепости (1940-е – первая половина 1950-х гг.) / К. Ганцер // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2018 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2019. – Вып. 17. – С. 21–30.

[1] *Ganzer, Ch.* Kampf um die Brester Festung. Ereignis – Narrativ – Erinnerungsort / Ch. Ganzer. – Paderborn : Verlag Ferdinand Schöningh, 2021. – 490 S.

[2] *К. Ганцар, К.* [Рэцэнзія] Штурм Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 36–37. – Рэц. на кнігу : Алиев, Р. В. Штурм Брестской крепости / Р. В. Алиев. – М. : Яуза ; Эксмо, 2008. – 800 с.; *Ганцар, К.* Памяць і забыццё : ушанаванне герояў Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар // Вяртанне ў Еўропу : Мінулае і будучыня Беларусі / пад рэд. А. І. Пашковіч. – Варшава : Лазарскі, 2011. – С. 140–147; *Ганцар, К.* «Гераізм, трагізм, мужнасць». Музей абароны Берасцейскай крэпасці / К. Ганцар, А. І. Пашковіч // ARCHE. – 2013. – № 2. – С. 43–59; *Ганцар, К.* Немецкие и советские потери как показатель продолжительности и интенсивности боев за Брестскую крепость / К. Ганцар // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2013 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2014. – Вып. 12. – С. 44–52; *Ганцар, К.* Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць / К. Ганцар // ARCHE. – 2014. – № 5. – С. 135–153; *Ганцер, К.* Воспоминания защитников Брестской крепости как исторические источники. Проблемы и шансы / К. Ганцер // Личность в истории. Героическое и трагическое : сб. материалов VI междунар. конф., Брест, 22–23 нояб. 2013 г. :

даследаванне выклікае асабліва вялікі інтарэс у гісторыкаў вайны, а таксама тых, хто надае пэўную ўвагу згаданай гістарычнай тэматыцы.

Заўважым, што за больш чым паўгадовы тэрмін пасля выхаду кнігі інфармацыя аб гэтым не стала, фактам навуковага, грамадскага і музычнага жыцця. Ні ў Інтэрнэце, ні ў сродках друку, ні на дошках абвестак Музея абароны Брэсцкай крэпасці пакуль не прызначана дата навуковай канферэнцыі, метадалагічнага семінара ці спецыяльнага круглага стала, у цэнтры якіх значыўся б аналіз новай нямецкай працы, у першую чаргу знаёмства з нямецкім даследаваннем і абмеркаванне яго галоўных вынікаў, зробленых прадстаўніком германскай гістарычнай навукі на аснове крытычнага падыходу да вялікага масіву дакументальных першакрыніц і гістарыяграфічных фактаў рознага паходжання. Як паказаў К. Ганцар у ходзе 25-хвіліннага даклада перад беларускімі, нямецкімі, польскімі і расійскімі гісторыкамі на 20-й Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» 2 красавіка 2020 у МДЛУ[1], ад вядзення навуковай дыскусіі абодва бакі толькі выйграюць. Каб пазбегнуць фальсіфікацыі гісторыі, спрэчкі аб гістарычнай ісціне павінны адбывацца на навуковай глебе шляхам свабоднай дыскусіі паміж рознымі бакамі, але пры ўмове выкарыстання неабходных дакументаў, а не ідэалагічных клішэ ці прапагандысцкіх міфаў, трывала замацаваных у сучаснай беларускай гістарыяграфіі і музейным дыскурсе з савецкага часу.

Нам бачыцца, што вынікам такога дыялогу магло б стаць навуковае абагачэнне кожнага з бакоў за кошт пераканаўчых аргументаў і неабвержных фактаў апанента, а таксама прырашчэнне новых ведаў у інтарэсах гіста-

---

в 2 ч. / под. ред. Е. И. Пашкович. – Брест : БрГУ им. А. С. Пушкина, 2015. – Ч. 2. – С. 32–42; *Ганцар, К.* Памяць пра вайну і акупацыю ў Беларусі на прыкладзе мемарыялаў «Брэсцкая крэпасць-герой» і «Хатынь» / К. Ганцар // ARCHE. – 2015. – № 9. – С. 284–304; *Ганцер, К.* Переводчик виноват. Влияние перевода на восприятие исторических событий (на примере отчета о боевых действиях по захвату Брест-Литовска генерал-майора Шлипера) / К. Ганцер // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 11 крас. 2014 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2015 г. – Вып. 13 : у 2 т. – Т. 1. – С. 39–45; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – 723 с.; *Ганцер, К.* Сталина длинная тень. Плен как ключевая проблема историографии обороны Брестской крепости / К. Ганцер // Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – С. 22–41; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.; *Ганцер, К.* Развитие нарратива о «героической обороне» Брестской крепости (1940-е – первая половина 1950-х гг.) / К. Ганцер // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2018 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2019. – Вып. 17. – С. 21–30.

[1] *Ганцар, К.* 80 гадаў гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці : навука vs прапаганды / К. Ганцар // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць. Праграма 20-й міжнар. навук. канф., Мінск, 2 крас. 2021 г. – Мінск : МДЛУ, 2021. – С. 4, 15.

рычнай навукі ўвогуле і гістарычнай памяці ў прыватнасці. У той жа час супрацьстаянне азначае не што іншае як імкненне да захавання манаполіі на пэўную гістарычную ісціну, а таксама простае ігнараванне новых навуковых ведаў і даследчыцкіх падыходаў процілеглага боку.

Аналіз працы К. Ганцара паказвае, што не з усімі аўтарскімі высновамі і ацэнкамі можна адразу пагадзіцца, але іх пастаноўка ў вядучай замежнай гістарыяграфіі на цяперашні час з’яўляецца важным навуковым рубяжом: беларускай навуковай грамадскасці, музейным супрацоўнікам Мемарыялу «Брэсцкая крэпасць-герой» пасля выхаду ў свет новай працы на тэму абароны Брэсцкай крэпасці ў 1941 г. неабходна не толькі адказаць на новы выклік, але і даказаць ці абвергнуць практычную значнасць высноў навуковага даследавання, магчымасць іх далейшай інструменталізацыі ў беларускую гістарычную навуку, вучэбную і выхаваўчую працу, экскурсійную практыку, грамадскі дыскурс. Наколькі гэта магчыма? Адказ на пастаўленае пытанне дае зварот да метадалагічнай базы, пакладзенай гісторыкам у аснову праведзенага даследавання. Свой навуковы дыскурс аўтар вядзе шляхам наватарскага выкарыстання прыёмаў апісання гістарычных падзей, адбудоўвае каркас гістарычнага наратыву на падмурку аб’ектыўнасці і верыфікацыі ведаў. Абавязковым крытэрыем аўтар вызначае паўнату аналізу зместу гістарычнага наратыву, суадносіны як аб’ектыўных фактараў, так і суб’ектыўных фактаў, неабходны разгляд выключна ў кантэксце вядомых гістарычных падзей. Па перакананні К. Ганцара, рэальная сітуацыя патрабуе па магчымасці дакладнай і глыбокай інтэрпрэтацыі ўсяго комплексу дэталяў, фактаў і фактараў. Пры навуковым даследаванні існуе відавочная патрэба толькі ў гістарычных фактах, якія маюць аб’ектыўны характар і існуюць незалежна ад чыйсьці волі ці пажаданняў[1]. На наш погляд, майстэрства гісторыка праявілася ў тым, што ён трымаўся правіла па даследаванні баявых дзеянняў на аснове паказу падзей з двух бакоў; таму яму ўдалося не толькі выявіць, але і паказаць арганічную двухбаковую ўзаемасувязь – нямецкага штурму і савецкай абароны – і ў рэшце рэшт аднавіць паўнацэнную карціну падзей у Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.

Адзначым пры гэтым, што К. Ганцар аргументавана абгрунтоўвае свае высновы, на якія мае права, як і любы іншы даследчык, толькі пасля крытычнага аналізу цэлага комплексу крыніц і навуковай літаратуры. Іх пастаноўка часам у імператыўнай форме можа быць, на першы погляд не зусім акадэмічнай, але заўсёды ў дастатковай меры аргументаванай нямецкім аўтарам. У кантэксце гэтага беларускім гісторыкам неабходна таксама знайсці адказы, чаму ў адрас савецкага наратыву, часта адкрыта ідэалагізаванага ці мэтава палітызаванага, у сучаснай германскай гістарыяграфіі гучаць наступныя высновы: аб аднабаковасці паказу гістарычных падзей; неаб’ектыўнасці раскрыцця і замоўчвання найбольш важных фактаў; наўмыснага скажэння існуючых у найноўшай гістарыяграфіі ацэнак; стэрэатыпнай падачы гіста-

---

[1] *Ganzer, Ch.* Kampf um die Brester Festung. Ereignis – Narrativ – Erinnerungsort / Christian Ganzer. – Paderborn : Verlag Ferdinand Schöningh, 2021. – S. 8–11.

рычных звестак; недастаткова поўным выкарыстанні добра вядомых у цяперашні час дакументальных крыніц, асабліва нямецкага паходжання. У выніку такога падыходу нямецкі гісторык сцвярджае аб аднабаковасці адлюстравання хода баявых дзеянняў, факусіраванні галоўнай увагі ў савецкім і постсавецкім нарматывах толькі на аспектах гераічнай абароны крэпасці на шкоду рэальнаму паказу гістарычных падзей у кантэксце аб'ектыўных фактаў і аб масавай страце абаронцаў ці іх пападання ў нямецкі палон ў ходзе баёў за крэпасць у канцы чэрвеня 1941 г. Таму даследчыцкі фокус манаграфіі К. Ганцара наведзены на параўнанне, супастаўленне з дакументальнымі звесткамі гістарычнага апісання розных аўтараў. Яны ў сваёй сукупнасці дазваляюць глыбей усвядоміць і дакладней зафіксаваць унікальнасць гістарычнай абароны і верыфікаваць гістарычныя веды, без чаго ў цяперашні час нельга аб'ектыўна прадставіць існуючы навуковы наратыў.

Адзін з важных метадалагічных момантаў новага даследавання звязаны з першай часткай назвы кнігі *Kampf um die Brester Festung 1941* ("Бой за Брэсцкую крэпасць 1941 года"), дзе на першым месцы стаіць вызначальны назоўнік адзіночнага ліку бой (der Kampf). Змест працы пацвярджае гістарычны факт правядзення неаднаразовага нямецкага штурму гэтага рубяжа савецкай абароны, а таксама контратак абаронцаў, г.зн. двухбаковых шматдзённых *баёў* на тэрыторыі крэпасці, пра што піша сам аўтар[1]. Больш таго, па праведзеным даследаванні чырвонай ніткай праходзіць думка пра тое, што не толькі баявыя дзеянні пяхотных часцей германскага вермахта і Чырвонай арміі апынуліся ў фокусе шматгадовых ідэалагічных баталій, разгорнутых у пасляваенны час у адносінах захавання палітычнай, а не гістарычнай канцэпцыі нямецкага штурму і савецкай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Вынікам усяго гэтага сталі пасляваенныя так званыя "бітвы" на ідэалагічным, навуковым і музейных франтах, якія працягваюцца па цяперашні час. Таму ў якасці больш дакладнага тэрміна для назвы кнігі мог бы быць назоўнік, вытворны ад тэрміна *бітва*: які, на наш погляд, у назначана большай ступені адпавядае характару "баталій", якія па цяперашні час вядуцца ў поўным сэнсе гэтага слова за Брэсцкую крэпасць. Яны пачаліся амаль 80 гадоў, але не скончыліся і цяпер.

З выхадам новага нямецкага выдання не менш значным гістарыяграфічным фактам з'яўляецца вызначэнне ключавых даследчыцкіх тэзісаў: першы – аб ходзе двухбаковых баявых дзеянняў; другі – аб панесеных стратах часцямі вермахта і Чырвонай арміі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці цягам апошняй дэкады чэрвеня 1941 г. Адразу ж адзначым крытычны падыход, да якога звяртаецца нямецкі даследчык пры працы з архіўнымі першакрыніцамі. Ён максімальна поўна выкарыстоўвае іх для паказу падзей, абавязкова супастаўляючы з іншымі дакументамі і матэрыяламі, даволі часта малавядомымі, а таксама прыцягваючы эга-крыніцы былых удзельнікаў падзей, іх

[1] *Ganzer, Ch.* Kampf um die Brester Festung. Ereignis – Narrativ – Erinnerungsort / Ch. Ganzer. – Paderborn : Verlag Ferdinand Schöningh, 2021. – S. 33, 69.

асабістае ліставанне, фотаздымкі. Галоўнай мэтай такога падыходу з'яўлялася пераадоленне недахопу ў дакументах, выкарыстанне прамых і ўскосных доказаў у ходзе правядзення даследавання.

Кніга ўключае тры главы: першая прысвечана баям за Брэсцкую крэпасць у чэрвені 1941 г. (с. 69–114), другая носіць кароткую назву – «наратыў» (с. 115–313), трэцяя – раскрывае значэнне "месца памяці" (с. 314–429). Структура працы ўключае традыцыйныя часткі: уводную і заключную, спісы скарачэнняў, літаратуры і крыніц, а таксама імянны і геаграфічны паказальнікі. Для нагляднай ілюстрацыі тэкстаў выкарыстана вялікая колькасць дыяграм, табліц, фотаздымкаў, у тым ліку зробленых самім аўтарам, карт, малюнкаў, схем і інш. Дакументальную базу крыніц складаюць архіўныя і грамадскія фонды, у тым ліку Федэральнага архіва Германіі, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў і літаратуры і мастацтваў, Музея узброеных сіл (Масква), Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Музея "Брэсцкая крэпасць-герой", Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Верхнеаўстрыйскага зямельнага архіва, Аўстрыйскага дзяржаўнага архіва, а таксама зборы і прыватныя архівы, у тым ліку самога аўтара.

Пачынаецца праца грунтоўнымі ўводзінамі (с. 1–66), у якіх аўтар паказвае савецкі гістарычны наратыў, раскрывае ўласную пазіцыю ў даследчым працэсе, аналізуе стан даследавання тэмы, характарызуе дакументальную базу крыніц, падзяляючы іх на тыя, якія неабходны для даследавання баёў за крэпасць, і тыя, якія садзейнічалі аналізу працэсу фарміравання пасляваеннай культуры памяці. Аўтар таксама знаёміць з правіламі транслітарацыі пры выкарыстанні разнамоўных матэрыялаў.

Даследчык К. Ганцар сцвярджае, што са з'яўленнем яго публікацый па гэтай тэме ў постсавецкім дыскурсе пачалася навуковая дыскусія (с. 11), якая заклала падмурак для вядзення неабходнай дыскусіі ў канцы нулявых гадоў. Насамрэч сярод айчынных гісторыкаў яна была распачатая дзякуючы публікацыям расійскага гісторыка Р. В. Аліева[1] і беларускага даследчыка С. Я. Новікава[2].

Нямецкі аўтар не пагаджаецца з тым, што пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі была арганізавана абарона крэпасці, якая на першым этапе цягнулася да канца чэрвеня. Потым пачаўся другі этап барацьбы, якую на тэрыторыі захопленай крэпасці вялі асобныя ачагі супраціўлення. Як адзначана ў манаграфіі, у савецкім наратыве дзве галоўных ідэі з'яўляліся

---

[1] *Алиев, Р. В.* Штурм Брестской крепости / Р. В. Алиев. – М. : Яуза ; Эксмо, 2008. – 800 с.; *Алиев, Р. В.* Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р. В. Алиев. – М. : Вече, 2010. – 448 с.

[2] *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў / С. Я. Новікаў // Беларус. думка. – 2010. – № 5. – С. 88–97; *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці : традыцыйнае і новае ў гістарыяграфіі / С. Новікаў // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 28–35; *Новікаў, С.* Узяцце Брэсцкай крэпасці : гіст. дакумент / С. Новікаў // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 38–43.

апорнымі палажэннямі ў канцэпцыі аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.: 1) аб упартых, цяжкіх і шматдзённых баях за крэпасць; 2) аб самаахвярнай барацьбе кожнага абаронцы, часцей за ўсё да апошняй кроплі крыві (с. 8).

Як вынікае з працы, зыходнай кропкай пры правядзенні даследавання вызначаны баявыя дзеянні, якія мелі месца ў ходзе нямецкага штурму і савецкай абароны Брэсцкай крэпасці 1941 г. і былі замацаваны ў афіцыйнай Канцэпцыі аб арганізаванай абароне, якая працягвалася да пачатку трэццяй дэкады ліпеня месяца (с. 8). К. Ганцар прыходзіць да высновы аб супярэчлівасці такой тэзы па прычыне таго, што савецкі наратыў быў пабудаваны не на арыгінальных дакументальных крыніцах, а галоўным чынам на звестках белетрыстыкі, публікацыях журналістаў і ўспамінах (с. 12), элементы чаго па цяперашні час захоўваюцца ў беларускай гістарыяграфіі і існуючай музейнай экспазіцыі.

Аналіз гістарыяграфіі К. Ганцар праводзіць не па праблемна-храналагічным прынцыпе, а праз індывідуальны ўклад даследчыкаў у распрацоўку тэмы. У кнізе паказана, што аснову новых беларускіх і расійскіх выданняў па-ранейшаму складаюць успаміны і традыцыйная літаратура (с. 14). У даследаванні нямецкі аўтар аналізуе працы толькі пяці беларускіх і расійскіх аўтараў – С. Новікава (с. 14), Р. Аліева і І. Рыжова (с. 14), М. Платошкіна (с. 14), А. Пашковіч (с. 32) – тых, хто ў постсавецкі перыяд часу спрабаваў па-новаму аднавіць гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці[1]. Асаблівую ўвагу

[1] *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў / С. Я. Новікаў // Беларус. думка. – 2010. – № 5. – С. 88–97; *Новікаў, С.* Абарона Брэсцкай крэпасці : традыцыйнае і новае ў гістарыяграфіі / С. Новікаў // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 28–35; *Новікаў, С.* Узяцце Брэсцкай крэпасці : гіст. дакумент / С. Новікаў // БГЧ. – 2010. – № 6. – С. 38–43; *Новікаў, С.* Брэсцкая крэпасць у дакументах і ўспамінах / С. Я. Новікаў // БГЧ. – 2011. – № 6. – С. 27–33; *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці : у пошуку шляхоў навуковага даследавання / С. Я. Новікаў // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2011. – № 1. – С. 44–51; *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці : гістарыяграфічныя міфы і гістарычная рэальнасць / С. Я. Новікаў // Историческое наследие 1941 года в исследованиях и экспозициях музеев. Материалы Междунар. конф., посвященной 70-летию обороны Брестской крепости, Брест, 9–11 июня 2011 г. – Брест : БрГУ им. А. С. Пушкина, 2013. – С. 48–54; *Новікаў, С. Я.* Узяцце крэпасці Брэст-Літоўск у нямецкай гістарыяграфіі / С. Я. Новікаў // Беларусь улетку 1941 г. : новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : МДЛУ, 2014. – С. 17–23; *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці паводле айчынных прац / С. Я. Новікаў // Беларусь улетку 1941 г. : новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – С. 23–31; *Новікаў, С. Я.* Нямецкі штурм Цытадэлі ў дакументах вермахта / С. Я. Новікаў // Новікаў, С. Я. Беларусь улетку 1941 г. : новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – С. 31–36; *Алиев, Р. В.* Штурм Брестской крепости / Р. В. Алиев. – М. : Яуза ; Эксмо, 2008. – 800 с.; *Алиев, Р. В.* Брестская крепость. Воспоминания и документы : в 2 кн. / Р. В. Алиев. – М. : Вече, 2010. – 448 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость : в 2 кн. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов ; фото А. Суворов, Ю. Мулявко. – Брест : Полиграфика, 2012. – Кн. 1. – 272 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов. – М. : УП ПРИНТ, 2013. – Кн. 2, ч. 1. – 288 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость : в 2 кн. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов. – М. :

ў працы нямецкі гісторык надае расійскім даследчыкам Р. Аліеву і І. Рыжову, дзякуючы якім з'явіліся грунтоўныя гісторыка-дакументальныя выданні[1], заснаваныя на арыгінальных гістарычных дакументах аўстрыйскіх, беларускіх, германскіх, расійскіх архіваў і матэрыялах музейных фондаў. На наш погляд, у гэтым пераліку адсутнічае брэсцкі даследчык А. Сувораў[2], які ў сваім найноўшым выданні, падрабязна прааналізаваным у працы К. Ганцарам, спрабуе абапірацца ўсё больш на новыя дакументальныя звесткі, захоўваючы пры гэтым галоўныя палажэнні савецкага наратыву[3].

Аналіз прац заходніх даследчыкаў па пытаннях гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці і яе пасляваеннай мемарыялізацыі пераконвае К. Ганцара ў тым, што на цяперашні час ніхто з беларускіх, расійскіх і замежных даследчыкаў не праводзіў спецыяльнага даследавання, прысвечанага вывучэнню эвалюцыі гістарыяграфічнага і гістарычнага наратываў аб Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. У гэтым плане нам падаецца важным заўважыць, што нямецкаму даследчыку неабходна было б у гэтым пераліку згадаць працу святара 45-й пяхотнай дывізіі Р. Гшопфа, аўтара ўнікальнай працы «Мой шлях з 45-й пяхотнай дывізіяй» (Лінц, 1955)[4]. Аналізуючы змест дакументаў, К. Ганцар падзяляе іх на дзве групы, адпаведна па гісторыі баёў за Брэсцкую крэпасць і гісторыі культуры памяці, звяртае асаблівую ўвагу на пісьмовыя дакументы часцей вермахта, эга-дакументы і фотаздымкі, якія даследчыку ўдалося не толькі выявіць, але і падрыхтаваць разам з беларускімі гісторыкамі ў якасці асобнага навуковага выдання (2016, 2017)[5]. Як вынік, К. Ганцар прыходзіць

---

УП ПРИНТ, 2013. – Кн. 2, ч. 2. – 220 с.; Брестская крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2010. – 256 с.; Брестская крепость. Форпост славы. Краткий путеводитель / авт.-сост. А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2018. – 60 с.; *Платошкин, Н. Н.* «Особенно ожесточенно оборонялся гарнизон имеющей важное значение крепости Брест» / Н. Н. Платошкин // Военно-ист. журн. – 2013. – № 6. – С. 16–20; *Пашкович, Е.* Брестская крепость в официальном нарративе в современной Беларуси / Е. Пашкович // Sleszynski, Wojciech (Hg.) : Wspolne czy osobne? Miejsca pamieci narodow Europy Wschodnej. – Bialystok/Krakow, 2011. – S. 49–55.

[1] *Алиев, Р. В.* Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р. В. Алиев. – М. : Вече, 2010. – 448 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость : в 2 кн. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов ; фото А. Суворов, Ю. Мулявко. – Брест : Полиграфика, 2012. – Кн. 1. – 272 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость : в 2 кн. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов. – М. : УП ПРИНТ, 2013. – Кн. 2, ч. 1. – 288 с.; *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость : в 2 кн. / Р. В. Алиев, И. Ю. Рыжов. – М. : УП ПРИНТ, 2013. – Кн. 2, ч. 2. – 220 с.

[2] Брестская крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2010. – 256 с.; Брестская крепость. Форпост славы. Краткий путеводитель / авт.-сост. А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2018. – 60 с.

[3] Брестская крепость. Форпост славы. Краткий путеводитель / авт.-сост. А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2018. – 60 с.

[4] *Gschöpf, R.* Mein Weg mit der 45. Infanterie-Division / R. Gschöpf. – Linz : Oberösterreichiescher Landesverlag, 1955. – 303 S.

[5] Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – С. 55–472; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – 2-е изд., испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – С. 55–472.

да высновы, што са шматлікіх дакументаў, даступных на цяперашні час, у тым ліку шырокай грамадскасці, становіцца відавочным: для дэталёвага аналізу хода двухбаковых баёў у крэпасці і панесеных пры гэтым стратах у наяўнасці ёсць даволі шмат дакументаў. Нягледзячы на іх публікацыю некалькі гадоў таму, да гэтага часу ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі не праводзілася цэласнага аналізу двухбаковых падзей у Брэс-цкай крэпасці летам 1941 г.

У першай главе «Падзея. Баі за Брэсцкую крэпасць ў чэрвені 1941 г.» (с. 69–114) К. Ганцар акцэнтуе ўвагу на разглядзе ходу баявых дзеянняў у першыя дні нямецкага штурму крэпасці, падрабязна і абгрунтавана раскрываючы яго на падставе шматлікіх дакументаў германскага вермахта. Галоўная ідэя аўтара заключаецца ў паказе баявых дзеянняў скрозь прызму нямецкіх і савецкіх страт у ходзе апошняй дэкады чэрвеня. Гісторык спачатку скрупулёзна аналізуе нямецкія страты на прыкладзе звестак аб забітых і параненых (с. 96–103), потым савецкія страты, раскрываючы іх маштабы праз аналіз колькасці савецкіх чырвонаармейцаў, якія да канца месяца апынуліся ў нямецкім палоне (с. 103–110). Для нагляднасці ў кнізе прыведзены табліцы аб стратах 45-й дывізіі забітымі, пачынаючы ад 22 чэрвеня і да 1 ліпеня 1941 г. З чаго вынікае, што галоўная частка страт прыпадае на першыя тры дні баявых дзеянняў, калі быў забіты 371, ці 86,3 % ад усіх забітых (430) салдат вермахта (с. 100). Савецкія страты нямецкі гісторык паказвае таксама ў табліцы (с. 106), з якой вынікае штодзённая карціна савецкага палону, яе характарызуюць дзве граніцы: ніжняя – колькасцю ў 6 713 чырвонаармейцаў і верхняя – у 7 779 палонных. Зыходзячы з дакументаў, нямецкі даследчык аднаўляе храналогію баёў за крэпасць, падзяляючы іх на тры фазы: 1) першыя тры дні баёў з 22 па 24 чэрвеня: перыяд, калі на тэрыторыі крэпасці вяліся цяжкія баі; у гэты час нямецкі бок панёс самыя цяжкія страты – амаль 86,3 % забітых і да 70–80 % параненых нямецкіх салдат, а таксама захоп у нямецкі палон 56 % савецкіх салдат; 2) у час другой фазы (25–26 чэрвеня) былі ліквідаваны асобныя ачагі супраціўлення; на гэты час прыпадае амаль 7 % нямецкіх страт забітымі і каля 30 % савецкіх ваеннапалонных; 3) цягам трэццяй фазы – з 27 па 29 чэрвеня – быў ліквідаваны апошні аб’ект актыўнай абароны – Усходні форт на паўночным востраве. За гэты час вермахт не панёс істотных страт, тады як з савецкага боку колькасць палонных склала амаль 14 % (с. 112).

З даследавання вынікае, што на цяперашні час вядома амаль 40 дакументаў, у якіх ідзе размова пра палон савецкіх салдат у ходзе баёў за Брэсцкую крэпасць (с. 111). У сваім даследаванні нямецкі аўтар аспрэчвае прынятыя ў савецкім наратыве сцвярджэнні аб 32-дзённай працягласці абарончых баёў на тэрыторыі крэпасці. Нямецкія дакументы даюць дакладны адказ: галоўныя сілы 45-й пяхотнай дывізіі пасля выканання баявой задачы па захопу крэпасці пакінулі яе і выйшлі з Брэста ў напрамку Пінска 2 ліпеня 1941 г. Як адзначае аўтар, ні ў адным вядомым на цяперашні момант дакуменце аб падзеях пачатку і сярэдзіны ліпеня не ўтрымліваюцца звесткі пра

тое, што пасля ўзяцця Усходняга форта мелі месца факты баявога супраціўлення (с. 112). У адносінах даных, якія захоўваюцца ў картатэцы Мемарыяла і паходзяць з уліковых картачак на савецкіх ваеннапалонных з іншых лагераў, аўтар прыходзіць да высновы, што шматлікія даныя не адпавядаюць гістарычнай рэальнасці пасля іх зверкі з іншымі дакументамі. Але галоўнай ідэяй гэтага з'яўляецца тое, што, нягледзячы на наяўнасць на тэрыторыі крэпасці асобных чырвонаармейцаў, у нямецкіх дакументах не пацверджаны ні адзін факт вядзення ці працягу актыўных баявых дзеянняў з савецкага боку (с. 114).

У другой главе «Наратыў» К. Ганцар аналізуе эвалюцыю фарміравання афіцыйнага савецкага наратыву (с. 115–313). Аўтар раскрывае ўмовы яго фарміравання ў дачыненні да гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці, вызначаючы асноўныя фазы колькаснага і якаснага развіцця, паказваючы гэты працэс на прыкладзе разгляду функцый літаратурнай цэнзуры, узрастаючай ролі ваенных і значэння савецкага патрыятызму. Асаблівая роля пры гэтым належала цэнтральнай установе – Галоўнаму ўпраўленню па справах літаратуры і выдавецтваў (Галоўліту), без дазволу якога ў савецкай краіне не магла з'явіцца ні адна публікацыя, ні адна радыё- ці тэлеперадача, а таксама фільмы і кіно, пастаноўкі ў тэатрах і экспазіцыі музеяў. Як заўважае аўтар, з адкрыццём Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» падзеі, звязаныя з гераічнай абаронай, ператварыліся ў сакральную старонку савецкай гісторыі, былі ўнесены ў спіс табуіраваных тэм, распавядаць пра якія дазвалялася выключна ў рамках тэзіса аб «героях-абаронцах», «гераічнай абароне» і «пачатку Вялікай Перамогі». Аўтар паказвае, як праводзілася ідэя падпарадкавання гістарычнага наратыву інтарэсам партыйнай палітыкі (с. 230).

Дзякуючы новай нямецкай працы ў фокусе даследавання апынулася самае складанае пытанне гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. – лёс тысяч савецкіх ваеннапалонных (с. 236–265), якія ў ходзе баёў апынуліся ў нямецкім палоне. Пры гэтым К. Ганцар прыходзіць да важнага назірання, што з савецкага наратыву выцякала галоўная ідэалагема – абарона Брэсцкай крэпасці павінна стаць адзіным з савецкіх месцаў памяці без фактаў палону (с. 238). Толькі летам 2014 г. у адной з захаваных частак кальцавой казармы была ўпершыню адкрыта спецыяльная музейная экспазіцыя «Музей вайны – тэрыторыя міру» (с. 410). У дачыненні да апошняга нямецкі аўтар сцвярджае, што вынесеная за межы музея гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці новая экспазіцыя аб палоне, без дакладнай прывязкі да саміх абаронцаў і абароны, сведчыць толькі пра тое, што ў Музее абароны нават у новых умовах не знайшлося месца для гэтага надзвычай важнага гістарычнага факта канца чэрвеня 1941 г. Аўтар заўважае, што поўнае і праўдзівае вяртанне гісторыі савецкага палону ў час абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. патрабуе яшчэ доўгага шляху, паколькі да цяперашняга часу захоўваюцца нязменнымі большасць элементаў наратыву аб «гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці» (с. 265). Не менш дзіўным аўтар бачыць факт успрыняцця навуковай і музей-

най грамадскасцю спецыяльнага выдання «Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии» (2016, 2017) з 188 арыгінальнымі дакументамі. Таму не з’яўляецца нечаканай выснова нямецкага аўтара, што аснову савецкага наратыву складаюць у меншай ступені дакументальныя крыніцы, а ў большай – суб’ектыўныя звесткі (с. 313).

У трэццяй главе К. Ганцар паказвае Брэсцкую крэпасць як «месца памяці» (с. 314–429), дзе падрабязна прасочвае гісторыю ўшанавання памяці аб гераічным мінулым абароны Брэсцкай крэпасці: паказвае асноўныя этапы ўзвядзення мемарыяльнага комплексу (с. 314–334), раскрывае місію гістарычнай дзейнасці “Брэсцкай крэпасці-героя” (с. 334–353), а таксама характарызуе ролю музеяў абароны крэпасці і новай экспазіцыі «Музей вайны – тэрыторыя міру» (с. 410–421). Асаблівы інтарэс у чытача выклікае аналіз гісторыкам скрозь прызму музейнага менеджменту канцэпцыі новай экспазіцыі «Музей вайны – тэрыторыя міру», адкрытага 22 чэрвеня 2014 г. у паўднёва-усходняй частцы кальцавой казармы. Нямецкі аўтар адзначае, што 8 залаў маюць выгляд сучаснай экспазіцыі, у якой актыўна выкарыстоўваюцца музейная тэхніка, муляжы фігур людзей, інтэрактыўныя эфекты, камп’ютарныя праекцыі, а таксама аўдыёгіды (с. 410). Аўтар заўважае, што сярод экспанатаў савецкага паходжання можна сустрэць шматлікія нямецкамоўныя дакументы і перакладзеныя тэксты, а таксама фотаздымкі нямецкага паходжання. У той жа час К. Ганцар заўважае, што для наведвальніка новай экспазіцыі застаецца адкрытым галоўнае пытанне аб маштабах страт абаронцаў і колькасці савецкіх палонных падчас баёў за Брэсцкую крэпасць летам 1941 г. (с. 426–427). Падсумоўваючы матэрыял заключнай падглавы, нямецкі аўтар робіць выснову, што вынікі навуковай працы і лёсы савецкіх ваеннапалонных пачынаюць пастуупова інтэгравацца ў сучасны музейны дыскурс, дзе як і раней, пануюць такія крытэрыі, як гераізм, мужнасць і патрыятызм (с. 427).

Знаёмства з дадзенай працай прыводзіць да шматлікіх высноў, у тым ліку метадалагічнага кшталту. Заслугоўвае ўвагі тое, як пераканаўча, лагічна і доказна К. Ганцар знаёміць чытача з уласнымі вынікамі па даследаванні гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Па-першае, шматлікія прыведзеныя думкі аўтара заклікаюць чытача да роздуму, што можна толькі вітаць. Па-другое, даследчык імкнецца трымацца выключна выверанных і верыфікаваных фактаў і адстойвае гэты тэзіс на працягу ўсяго даследавання, ставячы ў яго падмурак выключна правераныя дакументальныя крыніцы. Па-трэцяе, аўтар паказвае перспектыву выкарыстання новых крыніц і метадалагічных падыходаў, асабліва такога простага правіла, як абавязковы двухбаковы паказ баявых дзеянняў. Па-чацвёртае, К. Ганцар не сумняваецца ў неабходнасці «альтэрнатыўнага» падыходу пры правядзенні даследавання, асабліва беларускімі гісторыкамі. Па-пятае, выказванне ўласных гіпотэз нямецкі аўтар суправаджае навуковымі аргументамі, што

дазволіла яму, як аднаму з першых даследчыкаў, наблізіцца да гістарычнай ісціны ў пытаннях гісторыі нямецкага штурму і савецкай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.

Такім чынам, з’яўленне новага нямецкамоўнага фундаментальнага даследавання ставіць на парадак дня беларускай гістарычнай навукі і музейнай практыкі прынцыпова важныя пытанні, якія ў 80-я ўгодкі з пачатку абароны Брэсцкай крэпасці набываюць асаблівае значэнне. Галоўны адказ на іх будзе заключацца ў тым, якім чынам і ў якой ступені замежная навуковая распрацоўка стане фактам айчыннай гістарыяграфіі, у першую чаргу беларускай, знойдзе адлюстраванне ў канцэпцыі музейнай экспазіцыі Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» і будзе выкарыстоўвацца ў індывідуальных тэкстах экскурсій для турыстаў з розных краін, у тым ліку з Германіі. Можна пажадаць, каб напярэдадні векавога рубяжа абарона Брэсцкай крэпасці выклікала хвалю даследчыцкага інтарэсу да падзей, якія аказвалі цэлыя дзесяцігоддзі значны, але да канца не асэнсаваны ўплыў на гісторыю і культуру памяці ў Беларусі.

У цэлым, на нашу думку, сучасная беларуская і замежная гістарыяграфіі пакуль не ведалі прыкладаў настолькі скрупулёзнага, глыбокага і ўсебаковага даследавання цэлага комплексу розных гістарычных крыніц на аснове метаду кампаратыўнага аналізу. Важным тут з’яўляецца таксама і даследчыцкі падыход аўтара, у аснове якога ляжыць абавязковае правядзенне дэталёвай верыфікацыі фактаў з дакументальных крыніц і гістарыяграфічных прац, у тым ліку найноўшых. Відавочна, што на справе практычна ўпершыню зроблены неверагодны прарыў у германскім ваенным беларусазнаўстве.

У заключэнні важна адзначыць ключавы вынік аналізу новай працы К. Ганцара – сучасная беларуская гістарыяграфія апынулася перад складаным выбарам: пачаць грунтоўную працу па даследаванні гісторыі абарончых баёў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., асновай якой з’явіцца комплекс нямецкіх крыніц, у апошні час уведзеных у зварот, ці застацца ў кантэксце палажэнняў савецкага наратыву, у якім практычна адсутнічае «нямецкі погляд» на падзеі. У гэтым выпадку абставіны ставяць нас перад неабходнасцю зноў пачаць скрупулёзнае вывучэнне мінулага на аснове распрацоўкі пытанняў тэорыі і метадалогіі, праблем крыніц і археаграфіі. Добрым арыенцірам для даследчыкаў у гэтым пакуль няпростым наратыве можа выступаць унікальная манаграфія К. Ганцара, пераклад якой перад беларускай навуковай грамадскасцю таксама выступае ў якасці першачарговай задачы.

***Сяргей Новікаў,***
*кандыдат гістарычных навук*

*Поступила в редакцию 24.03.2022*